ЯЗЫК И МЕЖКУЛЬТУРНЫЕ КОММУНИКАЦИИ

III МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
(Мінск – Вільнюс, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Вільнюскі педагагічны ўніверсітэт, 17 – 20 траўня 2011 года)

Канферэнцыя «Язык и межкультурные коммуникации» чарговы раз сабрала навукоўцаў з розных куткоў свету. Геаграфічна кола ўдзельнікаў было прадстаўлена не толькі краінамі былых саюзных рэспублік (Украіна, Польшча, Расія, Латвія, Эстонія, Грузія, Азербайджан, Казахстан), але і далёкім замежжам (Вялікабрытанія, ЗША, Германія, Нігерыя). Атмасфера супрацоўніцтва і плённай працы згуртавала навукоўцаў, якія прыехалі на гэтую канферэнцыю не першы раз, як на традыцыйную для сябе, а таксама і новых удзельнікаў. Праграма канферэнцыі была цікавай і разнастайнай. Пачатак працы быў запланаваны ў Мінску 17 – 18 траўня, працяг – у Вільнюсе 19 – 20 траўня.

Пленарнае пасяджэнне па традыцыі адкрылі мадэратары: у Мінску – дэкан факультэта рускай філалогіі БДПУ імя М. Танка ***В. Старычонак***, у Вільнюсе – дэкан філалагічнага факультэта ВПУ ***К. Гінтаутас***.

У **Мінску на пленарным пасяджэнні** першы даклад ***К. Абдулаева***, рэктара БСУ, (Баку, Азербайджан) *«Роль Бакинского славянского университета в межкультурном диалоге»* абазначыў культурныя і філалагічныя дачыненні беларускага і азербайджанскага боку, а таксама сімвалічна прадставіў сутнасць канферэнцыі як мерапрыемства па збліжэнні розных культур на аснове філалагічнага супрацоўніцтва. Рэальным сведчаннем палітыкі міжкультурнага ўзаемадзеяння стала адкрыццё ў чэрвені 2010 года ў Бакінскім славянскім універсітэце цэнтра беларускай мовы і культуры, а ў снежні гэтага ж года пры БДПУ імя М. Танка – цэнтра азербайджанскай мовы і культуры. ***М. Конюшкевич*** (Гродна, Беларусь) распавяла пра *«Диссонансные ситуации в речевом общении»*, іх асаблівасці і прычыны. Культуралагічныя перадумовы моўных працэсаў былі прадстаўлены ў выступе ***І. Касмарскай*** (Масква, Расія) *«Этнические стереотипы как факт культуры»*. У дакладзе *«Иноязычные лексические вкрапления как проявление социокультурной интерференции (на примере польского регионолекта Вильнюсского края)»* ***І. Масойць*** (Вільнюс, Літва) абазначыла запазычанні як прадуктыўны сродак узаемадзеяння носьбітаў розных моў у межах пэўнай сацыяльнай прасторы.

Далейшая праца канферэнцыі прайшла ў межах **сямі секцый:**

Секцыя 1. ***«Мова ў полікультурнай прасторы»***.

Секцыя 2. ***«Міжкультурныя камунікацыі і СМІ. Нацыянальна-культурная спецыфіка сродкаў камунікацыі»***.

Секцыя 3. ***«Лінгвакраіназнаўства і этналінгвістыка»***.

Секцыя 4. ***«Герменеўтыка і мова магчымых светаў»***.

Секцыя 5. ***«Метафара і вобразы мовы»***.

Секцыя 6. ***«Культура маўленчых зносін. Маўленчыя паводзіны. Маўленчы этыкет»***.

Секцыя 7. ***«З вопыту стварэння нацыянальна арыентаваных вучэбных матэрыялаў у парадыгме міжкультурнай камунікацыі»***.

На **пленарным пасяджэнні ў Вільнюсе** ***Л. Плыгаўка*** (Вільнюс, Літва) выступіла на тэму *«Беларуская вышэйшая адукацыя ў агульнаадукацыйнай структуры Літоўскай Рэспублікі»*, распавёўшы пра вопыт навучання па спецыяльнасці «беларуская мова» ў Вільнюскім педагагічным універсітэце. Госця з далёкай Мінесоты ***Б. Рэні*** (ЗША) прадставіла вынікі эксперыментальнага даследавання ***«Language, Identity and the Belarusian Diaspora»***. З шэрагам пытанняў, якія задаваліся ўдзельнікам эксперыменту аўдыторыя магла пазнаёміцца праз раздатачны матэрыял. ***В. Старычонак*** (Мінск, Беларусь) выступам *«Характер взаимодействия языков и диалектов в белорусско-литовском пограничье»* звярнуў увагу на тэндэнцыі моўнага функцыянавання і фактары, якія ўплываюць на гэты працэс у абазначаным рэгіёне. У дакладзе *«Толстовское толкование сакральной лексики»* ***Р. Наўрузаў*** (Баку, Азербайджан) прадставіў Л. Талстога як даследчыка сакральных тэкстаў, які з увагай ставіўся да сэнсавых і кантэкстуальных асаблівасцяў слова.

Калі казаць пра секцыйныя пасяджэнні ў Вільнюсе, то тэматычны працяг мела толькі 2-я секцыя. Акрамя таго, працавалі **секцыі:**

***- «Тэорыя і практыка перакладу ў аспекце міжкультурных камунікацый»*;**

***- «Мова як дэтэрмінант нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі асобы»*;**

«Літоўска-беларуска-польска-латышскае памежжа як рэгіён балта-славянскіх культурных і моўных кантактаў».

У межах канферэнцыі ладзілася і святкаванне 20-годдзя беларусістыкі ў Літве, непасрэднае дачыненне да чаго мае Цэнтр беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры (а раней – кафедра) у Вільнюскім педагагічным універсітэце на чале з дырэктарам Л. Плыгаўкай. Статус цэнтра, які кафедра набыла ў 2009 годзе, дазволіў ажыццяўляць не толькі адукацыйныя мэты – рыхтаваць настаўнікаў для беларускіх школ у Літве, але і навукова-даследчыя, асветніцкія, культурныя праграмы. Кафедра была актыўным арганізатарам беларускай сярэдняй школы імя Францішка Скарыны ў Вільні, навучэнцы якой прыйшлі павіншаваць гасцей канферэнцыі беларускімі спевамі, падтрымлівала дзейнасць Таварыства беларускай школы, сыніцыявала стварэнне кафедры літуаністыкі ў БДПУ імя М. Танка, дзе студэнты засвойваюць літоўскую мову як спецыяльнасць. Дзейнасць Цэнтра была праілюстравана яшчэ і выставай кніжных выданняў філолагаў Вільнюскага педагагічнага ўніверсітэта.

У разнастайнай тэматыцы канферэнцыі былі закрануты найбольш важныя праблемы міжкультурнай камунікацыі, што не магло не выклікаць цікавасць шырокага кола навукоўцаў. Мерапрыемствы падобнага кшталту – добры спосаб падтрымання беларуска-літоўскіх і іншых суседскіх культурных стасункаў. Трэба зазначыць, што ўдалая форма арганізацыі канферэнцыі некалькімі навучальнымі ўстановамі дае добрыя вынікі. Працягам такога супрацоўніцтва з далучэннем у кола арганізатараў Маскоўскага гарадскога педагагічнага ўніверсітэта будзе міжнародная канферэнцыя XII Виноградовские чтения «Текст, контекст, интертекст» у лістападзе гэтага года.

С.М. Лясовіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)